*А. І. Бабко*

# РЭЛІГІЙНА-ФІЛАСОФСКІЯ ПОШУКІ ЯК ФАКТАР СТАНАЎЛЕННЯ СПЕКУЛЯТЫЎНАЙ ДЫЯЛЕКТЫКІ ГЕГЕЛЯ

Праблемы, звязаныя са станаўленнем гегелеўскай дыялектыкі, маюць істотнае гістарычна-філасофскае значэнне, бо гаворка ідзе аб надзвычай важным, уплывовым, «парадыгматычным» феномене ў гісторыі сусветнай філасофіі. Дадзеныя праблемы выклікаюць, аднак, цікавасць і ў кантэксце сучасных дыскусій аб суадносінах філасофіі і рэлігіі. Погляды Гегеля і ў гэтым плане выступаюць як парадыгматычныя. Але іх метадалагічным падмуркам з'яўляецца спекулятыўная дыялектыка, у працэсе фармавання якой калізіі, звязаныя са згаданымі суадносінамі, займаюць, у сваю чаргу, надзвычай важнае месца.

Станаўленне дыялектычнай метадалогіі Гегеля сілкавалася з разнастайных духоўных крыніц. Грунтоўнае значэнне меў пры гэтым «парадаксальны» характар рэвалюцыйнай эпохі, ва ўмовах якой згаданае станаўленне адбывалася. Надзвычай вострыя калізіі, характэрныя для грамадскіх працэсаў гэтага «нетрывіяльнага» часу, заўжды хвалявалі Гегеля і зрабіліся прадметам ягоных «шматгадовых штудый», грунтоўных і плённых [6, с.421]. Першы штуршок гэтай тытанічнай працы далі, аднак, звязаныя з драматычнымі рэвалюцыйнымі падзеямі перажыванні і ўражанні з ягонай маладосці, а як першы яе філасофскі падмурак выступіла кантаўская філасофія: малады Гегель зведаў магутны яе ўплыў, засведчаны ім самім у ягоным ліставанні з Шэлінгам [4, с.227]. У творчасці Канта надзвычай выразна выяўляецца супярэчлівы, «антынамічны» характар дадзенай гістарычнай эпохі, яна прасякнута гэтай драматычнай антынамічнасцю – момант у найвышэйшай ступені спрыяльны для далейшага разгортвання інтэнсіўных духоўных пошукаў.

У ранніх тэкстах Гегеля мы знаходзім шматлікія праявы моцнага Кантава ўплыву (рэзкае супрацьпастаўленне духоўных феноменаў, наданне грунтоўнага статусу такім этычным катэгорыям, як «маральная аўтаномія суб'екта», «чысты абавязак»). Знаходзім мы ў іх, аднак, і першыя праявы набліжэння нястомнай гегелеўскай думкі да дыялектычнай метадалогіі, да прынцыпу тоеснасці супрацьлеглых пачаткаў, што здзяйсняецца ў руху і развіцці.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Найяскравейшым сведчаннем такога набліжэння з’яўляецца выразна выяўленае ў першых творах Гегеля перакананне, што вырашэнне драматычных грамадскіх і індывідуальных калізій можа быць дасягнута толькі праз здзяйсненне арганічных, «сінтэтычных» форм арганізацыі духоўнага жыцця, і ў звязаным з гэтым перакананнем адштурхоўванні абстрактных, аднабаковых яго праяў.

Агіда маладога мысляра да ўсяго аднабаковага выявілася ў пэўнай ступені і ў тым моманце, што ў яго ранніх творах адсутнічаюць развагі метафізічнага характару: метафізічная праблематыка падаецца яму ў гэты час занадта абстрактнай, у ёй губляецца арганічная цэласнасць жыцця. Іншая рэч – рэлігія, якая, на яго думку, не застаецца проста ведамі: яна ўплывае на наша сэрца, пачуццё і волю [3, с.49]. Таму і засяродзіў сваю ўвагу малады Гегель на дадзеным духоўным феномене. У выніку адпаведных даследаванняў ён прыйшоў, аднак, да высновы, што ў пэўных сацыяльных варунках (калі ў грамадскім жыцці дамінуюць аўтарытарныя формы яго арганізацыі) высокі гуманістычны патэнцыял рэлігіі не можа быць раскрыты і задзейнічаны. Больш за тое, яна сама набывае ў такіх умовах неадэкватны сваёй унутранай існасці выгляд. Скажоную, пазбаўленую сваёй высокай духоўнасці рэлігію Гегель заве пазітыўнай, разумеючы пазітыўнасць як навязванне чалавеку норм і прынцыпаў (у дадзеным выпадку рэлігійных) без яго духоўнай санкцыі [5, с.200]. Асяродкам пазітыўнасці ў рэлігійнай сферы бачыцца маладому тэарэтыку хрысціянства (часам – у гэтай сувязі неабходна адзначыць ягоную працу «Жыццё Ісуса» – ён адыходзіць, аднак, ад тэзы аб пазітыўным характары хрысціянства ўвогуле і ўказвае на адрозненні, што выяўляюцца ў гэтым плане паміж раннімі і больш познімі этапамі яго развіцця [2]).

Вострая, бескампрамісная крытыка хрысціянства спалучаецца ў маладога Гегеля з распрацоўкай ідэалу гарманічнай асобы, здольнай супрацьстаяць усялякай пазітыўнасці (у дадзенай сувязі міжволі напрошваецца аналогія з творчасцю Фрыдрыха Ніцшэ). Гэта асоба, якая імкнецца ўзняцца па-над сваімі вузкімі і плыткімі суб’ектыўнымі інтарэсамі і ставіць перад сабой высокія і прыгожыя мэты. Дадзены ідэал быў здзейснены, як лічыць Гегель, у антычную эпоху, калі індывід на аснове свайго свабоднага рашэння браў на сябе клопат аб інтарэсах сваёй айчыны і быў гатовы самаадданa змагацца за яе свабоду і за яе росквіт. Грамадзянін дэмакратычнага

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

антычнага поліса жыў ідэяй сваёй дзяржавы, перад якой «знікала яго індывідуальнасць» [5, с.186]. Маладога максімаліста мала бянтэжыць, што такое адзінства прыватнага і ўсеагульнага, у якім першае губляецца (няхай сабе і па сваёй уласнай волі), з’яўляецца дастаткова аднабаковым (такі падыход будзе непрымальным у рамках яго сталай творчасці, дзе прыярытэт агульначалавечага зусім не азначае адмаўлення асабістага, індывідуальнага). Важна, аднак, што ідэя адзінства супрацьлеглых пачаткаў задзейнічана ўжо ў яго развагах і выходзіць у іх на пярэдні план.

Гэта мае месца і ў гегелеўскім поглядзе на гарманічную, цэласную асобу як на асобу дзейную, актыўную. Гегель указвае, што яе актыўнасць не застаецца толькі ўнутранай: вольны, гарманічна развіты індывід выступае як дзейны і ў знешнім, прыродным свеце. Яго дзейнасць грунтуецца пры гэтым на законах прыгажосці, і пераўтвораная на іх аснове прырода не з’яўляецца ўжо для яго чужой, ён пачуваецца тут як у частцы самога сябе [3, с. 78]. У гэтых развагах, апроч усяго іншага, дастаткова выразна гучыць асноўны матыў будучай эстэтычнай канцэпцыі Гегеля: ідэальнае, духоўнае здзяйсняе сябе ў пачуццёвым, наяўным быцці, прасякаючы і адухаўляючы яго.

Малады тэарэтык лічыць, што высокія і прыгожыя ідэі з неабходнасцю прадстаўлены ў чалавечай прыродзе, хаця і ў няяўным, «імпліцытным» выглядзе. Задача асобы – у тым, каб разгарнуць гэты іманентны разумны пачатак. Інтэнсіўныя духоўныя пошукі Гегеля ўмацавалі яго перакананне ў тым, што найбольш дзейсным сродкам для яе вырашэння з’яўляецца рэлігія, прычым яго ўвага ўсё больш засяроджваецца на сінтэтычнай, цэласнай прыродзе гэтага духоўнага феномена. Мысляр бачыць у рэлігіі ўвасабленне жыцця і любові – тых форм, што супрацьстаяць пазітыўнасці, мёртвай рэфлексіі, абстрактнаму абавязку (ён вызваляецца ад піетэта перад філасофіяй Канта і імкнецца выпрацаваць альтэрнатыўныя падыходы да тых духоўных праблем, што хвалююць яго). Справа ў тым, што ў жыцці, жывым пачуцці, любові пераадольваецца супрацьлегласць суб’екта і аб’екта, дасягаецца іх глыбокая еднасць, у якой маральны закон распускае сваю ўсеагульнасць, а суб’ект – сваю адмысловасць [1, с.109].

Звярнуўшыся да прынцыпу адзінства супрацьлеглых пачаткаў, Гегель – мысляр у найвышэйшай ступені паслядоўны, што было характэрна для яго і ў маладосці, – не мог спыніцца на аднабаковым супрацьпастаўленні паняцця, рэфлексіі, філасофіі, з

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

аднаго боку, і жыцця, любові і рэлігіі, з другога. Галоўным асяродкам іх сінтэзу падавалася яму напачатку менавіта сфера рэлігіі і любові. Але прызнанне філосафам наяўнасці «знятай» рэфлексіі ў жывых і канкрэтных духоўных формах, звязанае з усё больш поўным і ясным усведамленнем неабходнасці грунтоўнай, вострай супярэчнасці на шляху да жывой тоеснасці, у рамках якой яна захоўваецца ў якасці неад’емнага моманту, патрабавала ад яго ўважлівага аналізу ўсіх рэфлексіўных праяў духоўнага жыцця і іх зняцця.

У выніку адпаведных даследаванняў Гегель пераасэнсаваў суадносіны паняцця і пачуцця, рэфлексіі і жыцця, філасофіі і рэлігіі. Ён адкрыў высокі духоўны патэнцыял паняцця, яго здольнасць да разгортвання і зняцця грунтоўных супярэчнасцей, гэта значыць здольнасць быць жывым і рухомым. Такім чынам, ягоную спекулятыўную дыялектыку можна разглядаць як працяг і завяршэнне – на прынцыпова новым узроўні – па-юнацку максімалісцкай крытыкі «пазітыўных» духоўных форм (найперш хрысціянства), якою прасякнуты першапачатковыя этапы творчай эвалюцыі філосафа. Гэтаксама перакананне Гегеля ў вяршэнстве філасофіі ў духоўным жыцці, у зняцці на яе ўзроўні іншых духоўных форм, у тым ліку і рэлігіі, выступае як укаранёнае ў станаўленні ягонай уласнай філасофіі і яе метадалагічнай асновы, спекулятыўнай дыялектыкі, што фармуецца, як паказана вышэй, праз згаданае зняцце.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

*1. Гегель, Г. В. Ф.* Дух христианства и его судьба / Г. В. Ф. Гегель. – Философия религии: в 2 т. – М.: Мысль, 1975. – Т. 1. – С. 101–194.

*2. Гегель, Г. В. Ф.* Жизнь Иисуса / Г. В. Ф. Гегель. – Философия религии: в 2 т. – М.: Мысль, 1975. – Т. 1. – С. 35–100.

*3. Гегель, Г. В. Ф.* Народная религия и христианство / Г. В. Ф. Гегель. – Работы разных лет: в 2 т. – М.: Мысль, 1972. – Т. 1. – С. 45–86.

*4. Гегель, Г. В. Ф.* Письма / Г. В. Ф. Гегель. – Работы разных лет: в 2 т. – М.: Мысль, 1972. – Т. 2. – С. 213–530.

*5. Гегель, Г. В. Ф.* Позитивность христианской религии / Г. В. Ф. Гегель. – Работы разных лет: в 2 т. – М.: Мысль, 1972. – Т. 1. – С. 87–207.

*6. Biedermann, G.* Die Französische Revolution in der Sicht der deutschen Klassik / G. Biedermann, E. Lange. – Deutsche Zeitschrift für Philosophie. – 1987. – №5. – S. 414–423.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ